**Бяляўская, Н.** «А на вайне, як на вайне» / Н. Бяляўская // Родныя вытокі. — 2005. — 23 лют. — С. 2.

## «А НА ВАЙНЕ, ЯК НА ВАЙНЕ»



Новы 1980 год Валянцін Андрыеўскі сустракаў у акопах. У Афганістане тады ішла сапраўдная вайна. І ён, ваеннаслужачы тэрміновай службы, прызваны ў рады Савецкай арміі ў 1979 годзе, быў у ліку першых, хто стаў выконваць інтэрнацыянальны абавязак у «Афгане». Але спачатку хлопец з Масловіч трапіў у вучэбную часць і паўгода праслужыў дэсэнтнікам у горадзе Ганджунас, што ў Літве. Затым – у Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі. Адтуль да вайны яму заставалася некалькі крокаў. Праўда, даведаўся пра гэта, як і іншыя яго саслужыўцы, не адразу. Па трывозе іх паднялі ноччу, пагрузілі ў самалёт, а куды накіравалі – невядома. І толькі на аэрадроме ў Казахстане, куды прызямліліся на дазапраўку, калі салдатам прапанавалі ўзяць боепрыпасаў без абмежавання, хлопцы зразумелі – на вайну.

Гэта былі страшныя дні і ночы. Іх 18–19 гадовых, лічы, бязвусых юнакоў, кінулі ў самае пекла. Тады ўсё яшчэ толькі пачыналася. І гэты пачатак быў непрадказальным і нават неверагодным. Ставараліся банды душманаў, якія на сваёй тэрыторыі дзейнічалі агрэсіўна, – і ў гэтым мелі перавагу. Дэсантнікі Віцебскай дывізіі пастаянна былі ў рэйдах, на баявых заданнях, у гарах. На базу прыязджалі практычна толькі на дазапраўку.

Вар'яцкі рытм жыцця пад фізічнай і псіхалагічнай нагрузкай. Часам думалася, што вытрымаць гэта немагчыма.

А побач адкуль, снарадаў, мін валіліся на зямлю сябры. Было страшна і балюча. Цяпер Валянцін Станіслававіч смела можа сказаць, што тады разам з надзеяй і жаданнем жыць, з мужнасцю і стойкасцю было месца і юнацкім слязам, ад якіх па начах макрэлі падушкі.

У той страшнай вайне на чужбіне не маглі салдаты развітацца ў апошні раз з сябрамі, што загінулі, не маглі даць апошні салют. Такім чынам камандаванне абараняла іх ад нервовага ўзрушэння.

Не далей, чым тры кіламетры ад аэрадрома ў Ташкенце, дзейнічаў палатачны гарадок, дзе рабілі дамавіны, дзе былі халадзільнікі, адкуль адпраўлялі ў цынкавых трунах нашых хлопцаў...

А між тым жыццё ішло сваёй чаргой. Уперамешку з баявымі дзеяннямі былі сустрэчы з мірнымі жыхарамі. Адносіліся да нашых салдат яны добра.

– Размаўляць з імі было складана, – гаворыць Валянцін, – толькі з дапамогай перакладчыка. Можа, яны нас баяліся, а можа паважалі – толькі калі-некалі частавалі нас пячэннем, чымсьці іншым. Хаця жывуць у кішлаках людзі вельмі бедна.

А дамоў ляцелі лісты з нумарам палявой почты і галоўная ў іх вестка пра тое, што сын жывы. У гэтым бацькі бачылі сваё шчасце. А зразумець было проста кожнаму.

– Калі пасля Афганістана зноў вярнулі ў Баравуху – радасць была бясконцай, – гаварыць Андрыеўскі. – І не толькі для нас. Радаваліся за нас нават чужыя людзі. На вуліцы зіма, а мы ідзем па ваеннаму гарадку загарэлыя, абветраныя – і з намі вітаюцца ўсе. Людзі разумелі, адкуль мы, і бачна, добрым словам хацелі дакрануцца да нашага шчаслівага лёсу.

Добра тое, што добрым заканчваецца. Я ж гляджу на маладых мужчын, грудзі якіх увешаны ордэнамі і медалямі за баявыя заслугі. Прыгожа?! Сэрца кожнай маці балюча рвецца ад гэтай прыгажосці і кожная кропелька крыві паўстае супраць вайны. Мы за мір ва ўсім свеце. Мы за мірную стваральную працу і шчасце нашых сыноў.

**Н. Бяляўская**

**На здымку:** В. С. Андрыеўскі, ардэнаносец Хырвонай Зоркі і шматлікіх юбілейных медалёў.

Шчасця табе, абаронца! Доўгага і бязвоблачнага жыцця!